Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
__________Д.В. Герасімёнак
___”__________2022 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________Ю.М. Галкоўская
___”__________2022 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)

Складальнік:
А.А.Трусаў, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Разгледжана і рэкамендавана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.06.2022.
пратакол № 12

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнік:

*Трусаў А.А., дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*

Рэцэнзенты:

*Краснова Я.Л.,* вядучы навуковы супрацоўнік ДНУ “Цэнтр сістэмнага аналіза і стратэгічных даследаванняў” НАН Беларусі

*Смолик А.А. загадчык* кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, ,доктар культуралогіі, прафесар.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння:
кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны
(пратакол № 10 ад 19.05.2022 г.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Змест

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЫТЫЧНЫ РАДЗЕЛ 6
2.1 План-канспект лекцый 6
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 12
3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 12
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 14
4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў 14
4.2 Пытанні да самаправеркі 14
4.3 Пытанні да экзамена 14
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 17
5.1 Тэматычны план 17
5.2 Асноўная літаратура 18
5.3 Дадатковая літаратура 19

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Гістарычнае краязнаўства» - агульнаадукацыйная дысцыплина, выкладанне якой вядзецца ў паглыбленным аб'ёме ў форме лекцый, семінарскіх заняткаў і самастойнай работы. У гэтым курсе паслядоўна разглядаюцца эканамічныя і культурныя працэсы, якія спрыялі паступоваму тэхналагічнаму прагрэсу чалавецтва на ранніх этапах яго гістарычнага развіцця.

Гістарычнае краязнаўства – гэта навуковае вывучэнне рэгіянальнай гісторыі і гісторыка-культурнай спадчыны, жыцця і дзейнасці выдатных асоб, якія ўнеслі адметны ўклад у палітыку, эканоміку, літаратуру і мастацтва.

Гістарычнае краязнаўства з'яўляецца адным з важнейшых сродкаў адукацыі і выхавання чалавека. Краязнаўчая работа і яе матэрыялы ўплываюць на павышэнне якасці адукацыі, спрыяюць патрыятычнаму і эстэтычнаму выхаванню навучэнцаў, усебаковаму росту і развіццю іх здольнасцей, фарміраванню практычных навыкаў і ўменняў праводзіць самастойныя навуковыя даследаванні. Гістарычнае краязнаўства з'яўляецца неад'емнай складаючай дзейнасці музея і працы музейных супрацоўнікаў.

*Мэта* дысцыпліны – сфарміраваць у студэнтаў прафесійныя арыентацыі ў сферы гістарычнага краязнаўства, асвятленне пытанняў гістарычнага краязнаўства – грамадскага навуковага руху, скіраванага на ўсебаковае пазнанне краю і далучэння мясцовага насельніцтва да актыўнага ладу жыцця.

Задачы дысцыпліны:

- падрыхтаваць будучых музейных спецыялістаў да самастойнай гісторыка-краязнаўчай работы;
- раскрыць змест асноўных этапаў гісторыка-краязнаўчага пазнання Беларусі;
- вызначыць і акрэсліць асноўныя катэгорыі гісторыка-краязнаўчых крыніц;
- пазнаёміць студэнтаў з гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі;
- сфарміраваць ў іх беражлівыя адносіны да гісторыка-культурных каштоўнасцей;
- азнаёміцца з дзейнасцю рэгіянальных краязнаўчых музеяў.

*Змест* дысцыпліны раскрывае аб'ект, прадмет і метады гістарычнага краязнаўства, паказвае сацыяльна-культурную краязнаўчую дзейнасць як сферу практыкі, вызначае галіну гістарычнага краязнаўства як частку сацыякультурнай прасторы, характарызуе краязнаўчы музей як сацыяльны інстытут. Даецца характарыстыка краязнаўчага музея як навукова-даследчай і навукова-асветніцкай установы.

Зместам вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці "музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках) прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК–6 Мець навыкі работы ў камандзе.

САК–7 Мець навыкі фармулёўкі і абароны свайго меркавання.

ПК–1 Планаваць, арганізоўваць і ўдасканальваць дзейнасць службаў кіравання музейнай справай, аховай гісторыка-культурнай спадчыны, адукацыі і турызма.

ПК–2 Планаваць, арганізоўваць і весці менеджэрскую, маркетынгавую, фінансавую і пасрэдніцкую работу.

ПК–6 Мець навыкі фармуляваць задачы па праектаванні, эксплуатацыі і ўдасканаленні (у частцы інфармацыйнага забеспячэння) стацыянарных музейных экспазіцый, выставак і турыстычных маршрутаў.

ПК–14 Планаваць, арганізоўваць і весці навукова-метадычную і вучэбна-метадычную работу.

ПК–15 Праводзіць кансультаванне па пытанням музейнай справы, арганізацыі турызма і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

ПК–16 Здзейсняць паказ, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па перспектывам развіцця отраслі, інавацыйным тэхналогіям, праектам і вырашэнням.

ПК–17 Вызначаць інавацыі і спосабы іх дасягнення.

ПК–18 Працаваць з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай.

ПК–19 Ацэньваць канкурэнтаздольнасць і эканамічную эфектыўнасць распрацоўваемых музейных тэхналогій.

ПК–20 Выкарыстоўваць метады аналіза і арганізацыі ўнядрэння новых тэхналогій.

ПК–21 Складаць дамовы сумеснай дзейнасці па засваенні новых тэхналогій.

Дысцыпліна “Гістарычнае краязнаўства” ўзаемазвязана з такімі дысцыплінамі як “Гісторыя Беларусі”, “Археалогія”, “Сусветная гісторыя”.

У працэсе навучання прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей па дысцыплінах “Уводзіны ў спецыяльнасць”, “Этнаграфія”, “Археалогія”, “Гісторыя Беларусі”.

Пры выкладанні дысцыпліны “Гістарычнае краязнаўства” мяркуецца выкарыстоўваць тлумачальна-ілюстрацыйны, даследчы і праблемны метады навучання.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на развіццё творчых навыкаў, пошуку неабходнай інфармацыі з навукова-метадычнай літаратуры, газетных публікацый, радыё- і тэлеінфармацыі, Інтэрнэт-крыніц. Выкарыстоўваецца кантэнт-аналіз крыніц, прысвечаных актуальным праблемам краязнаўства і дзейнасці музеяў краязнаўчага профілю, на падставе якіх кожны студэнт піша адпаведныя рэфераты.

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне дысцыпліны “Гістарычнае краязнаўства” прадугледжана 58 гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 42 г., семінары – 16 г.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
## 2.1 План-канспект лекцый

Прадмет, мэты і задачы дысцыпліны “Гістарычнае краязнаўства”. Змест асноўных раздзелаў тэматычнага плана. Сувязь прадмета з іншымі дысцыплінамі гуманітарнага цыкла. Формы навучання і кантролю. Агляд літаратуры па дысцыпліне.

### Раздзел І. Тэарэтычныя асновы гістарычнага краязнаўства.

***Тэма 1. Краязнаўства як навуковая і вучэбная дысцыпліна***

Паняцце краязнаўства. Этымалогія тэрміна. Суадносіны беларусазнаўства, радзімазнаўства і краязнаўства. Краязнаўства як навуковая і вучэбная дысцыпліна. Аб’ект і прадмет краязнаўства як комплекснай дысцыпліны. Праблематыка краязнаўства. Метады краязнаўства, сутнасць краязнаўчага метада. Комплекснае і галіновае краязнаўства. Формы арганізацыі краязнаўчай работы ў краіне.

***Тэма 2. Характарыстыка гісторыка-краязнаўчых крыніц***

Гісторыка-краязнаўчыя крыніцы і іх тыпы.Заканадаўчыя помнікі, актавыя матэрыялы, эканоміка-геаграфічныя і гаспадарчыя апісанні як крыніцы гісторыка-краязнаўчай інфармацыі.

Інфармацыя краязнаўчага характару ў летапісах XII – XIV стст. і беларуска-літоўскіх летапісах. Мемуарная літаратура як гісторыка-краязнаўчая крыніца і праблемы яе рэпрэзентатыўнасці. Дзённікі замежных паслоў, успаміны і літаратурна-публіцыстычныя творы. Асаблівасці гісторыка-краязнаўчых апісанняў у мастацкай літаратуры.

Дзейнасць Мікалая Улашчыка і Адама Мальдзіса.

Картаграфічныя крыніцы. Інфармацыя краязнаўчага характару на старажытных картах (мапах).

Даведачныя выданні розных тыпаў як гісторыка-краязнаўчая крыніца. Перыядычны друк у сістэме крыніц вывучэння краю. Адлюстраванне гісторыка-краязнаўчай праблематыкі ў перыядычным друку.

***Тэма 3. Гістарычнае краязнаўства як галіна агульнага краязнаўства***

Азначэнне, аб’ект і прадмет гістарычнага краязнаўства. Метады гістарычнага краязнаўства. Праблематыка гістарычнага краязнаўства. Сацыяльныя функцыі гістарычнага краязнаўства. Месца гістарычнага краязнаўства ў сістэме гістарычных і культуралагічных дысцыплін. Роля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычнага краязнаўства ў рашэнні адукацыйных задач, яго значэнне для фарміравання і выхавання асобы і гістарычнай свядомасці нацыі.

## Раздзел II. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVIII – XIX ст.

### *Тэма 4. Гістарычнае краязнаўства ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст.*

Пачатак навуковага асэнсавання значнасці гісторыка-краязнаўчых даследаванняў. Характар гісторыка-краязнаўчых даследаванняў Беларусі ў XVIII ст.

Сацыяльна-палітычная сітуацыя ў Беларусі ў азначаны перыяд. Краязнаўчая дзейнасць пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі. Гісторыка-краязнаўчыя даследаванні Беларусі ў межах экспедыцый расійскіх вучоных і дзяржаўных дзеячоў.

Грамадская цікавасць да гісторыі роднага краю ў пачатку XIX ст. Уплыў Віленскага універсітэта на разгортванне гісторыка-краязнаўчага вывучэння Беларусі.

Выданне беларускіх старажытных дакументаў. Дзейнасць М. П. Румянцава, І. І. Грыгаровіча, І. М. Даніловіча і інш.

Краязнаўчая дзейнасць Т. Я. Нарбута і З. Я. Даленгі-Хадакоўскага.

### *Тэма 5. Гістарычнае краязнаўства ў другой трэці – сярэдзіне XIX ст. (1825 – 1861 гг.)*

Гісторыка-краязнаўчая праблематыка ў творах беларускіх паэтаў пачатку XIX ст. Дзейнасць таварыстваў філаматаў і філарэтаў у справе вывучэння і папулярызацыі беларускай гістарычнай спадчыны.

Сітуацыя на Беларусі пасля паўстання 1830 – 1831 гг. Змена паланізацыі на русіфікацыю.

Рускае геаграфічнае таварыства і яго дзейнасць у галіне гісторыка-краязнаўчага вывучэння Беларусі.

Уплыў еўрапейскіх гістарычных дасягненняў на развіццё гістарычнага краязнаўства і гістарычнай думкі ў Беларусі. Гісторыка-краязнаўчая праца І. Кулакоўскага, А. Рыпінскага, Р. А. Друцкага-Падбярэзскага, М. Балінскага і інш. Вывучэнне асобных рэгіёнаў Беларусі І. Б. Ярашэвічам, Р. С. Зянькевічам, К. А. Гаворскім і інш.

Краязнаўчая дзейнасць братоў К. П. Тышкевіча і Я. П. Тышкевіча, А. К. Кіркора, У. Сыракомлі, П. М. Шпілеўскага, М. В. Без-Карніловіча і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 6. Гістарычнае краязнаўства ў другой палове XIX ст. (1861 – 1900 гг)*

Пашырэнне кола навуковых таварыстваў, што займаліся гісторыка-краязнаўчымі даследаваннямі. Гісторыка-краязнаўчая дзейнасць губернскіх статыстычных камітэтаў і іх публікацыі гісторыка-краязнаўчага зместу. Заснаванне таварыстваў па вывучэнні асобных рэгіёнаў Беларусі. Дзейнасць археалагічных і археаграфічных камісіі, таварыстваў, якія існавалі пад патранатам царквы і іншых арганізацый.

Стварэнне Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства, яго экспедыцыі па вывучэнні Беларусі і выдавецкая дзейнасць. Узнікненне краязнаўчых арганізацый па даследаванні Беларусі за яе межамі.

Выданне зборнікаў дакументаў і матэрыялаў “Віцебская даўніна”, “Мінская даўніна” і інш. Публікацыя гісторыка-краязнаўчых матэрыялаў і даследаванняў у перыядычным друку.

Краязнаўчая дзейнасць А. М. Семянтоўскага, Ю. Крачкоўскага, А. П. Сапунова, Е. Р. Раманава, Д. І. Даўгялы і іншых. З’яўленне каштоўных прац па гісторыі, эканоміцы, этнаграфіі, мовазнаўству і культуры Беларусі.

## Раздзел III. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў ХХ – пачатку ХХІ стст.

### *Тэма 7. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў пачатку ХХ ст. (1900 – 1921 г.)*

З’яўленне аматарскага краязнаўства. Пашырэнне краязнаўчых даследаванняў на месцах. Удзел навучэнцаў у правядзенні гісторыка-краязнаўчых даследаванняў.

Стварэнне музеяў і фарміраванне гісторыка-краязнаўчых калекцый.

Працы А. С. Дэмбавецкага, М. В. Доўнар-Запольскага, Я. Р. Карскага, М. Я. Нікіфароўскага і іншых.

Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. і яе ўплыў на беларускае краязнаўства. Роля “Нашай Нівы” і выдавецтва “Загляне сонца і ў наша ваконца”. Першая сусветная вайна. Бежанства як нацыянальная катастрофа.

Адраджэнне краязнаўчага руху ў Беларусі у перыяд пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Дзейнасць таварыства “Папараць-кветка”, Смалярскага гуртка радзімазнаўства і інш. Арганізацыя краязнаўчых аб’яднанняў пры навучальных і навуковых установах.

### *Тэма 8. Гістарычнае краязнаўства БССР (1921 – 1941 гг.). Краязнаўства Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стварэнне і дзейнасць Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК) і яго роля ў распаўсюджванні гістарычнага краязнаўства. Развіццё краязнаўчай думкі (М. І. Каспяровіч, Д. М. Васілеўскі і інш.). Распрацоўка статутаў краязнаўчых арганізацый.

Буйнейшыя асяродкі гістарычнага краязнаўства ў Беларусі. Стварэнне краязнаўчых музеяў.

Часопіс "Наш край". Выданне неперыядычных краязнаўчых зборнікаў на месцах. Пытанні гістарычнага краязнаўства на старонках дзяржаўных перыядычных выданняў.

Згортванне краязнаўчага руху ў 1930-я гг. Спыненне дзейнасці ЦБК. Ліквідацыя краязнаўчых арганізацый. Лёсы выдатных краязнаўцаў.

Гістарычнае краязнаўства ў Заходняй Беларусі. Асноўныя арганізацыйныя формы заходнебеларускага краязнаўчага руху, іх мэтавая накіраванасць і ідэалагічныя установкі. Дзейнасць Польскага краязнаўчага таварыства.

Роля Віленскага ўніверсітэта ў развіцці заходнебеларускага краязнаўства.

Мясцовыя краязнаўчыя аб'яднанні. Стварэнне краязнаўчых музеяў на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Гісторыка-краязнаўчае вывучэнне Заходняй Беларусі навуковымі таварыствамі.

Даследаванні краязнаўчага зместу Р. Гарашкевіча, Ч. Пяткевіча, С. Адляніцкага-Пачобута і інш. Краязнаўчая спадчына Я. Булгака і Я.Драздовіча.

Перыядычныя краязнаўчыя выданні ў Заходняй Беларусі.

### *Тэма 9. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў другой палове XX ст. (1945 – 1991 гг.)*

Развіццё краязнаўчай работы ў пасляваенныя гады. Школьнае і турысцкае крязнаўства, пошукавая праца. Увядзенне краязнаўства ў праграму ВНУ. Стварэнне сеткі краязнаўчых музеяў у абласных і раённых цэнтрах Беларусі.

Стварэнне Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі".

Дзейнасць Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, краязнаўчай камісіі Беларускага фонду культуры, Беларускай краязнаўчай асацыяцыі. Аднаўленне работы Беларускага краязнаўчага таварыства (1989).

Краязнаўчая дзейнасць М.І.Ермаловіча, М.А.Ткачова і Г.А.Каханоўскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змены ў палітычным жыцці краіны ў другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гг. і іх уплыў на разгортванне гісторыка-краязнаўчых даследаванняў. Краязнаўчая дзейнасць грамадскіх таварystваў і аб'яднанняў ("Майстроўня" і "Талака" (Мінск), "Паходня" (Гродна), "Гродзенская краязнаўчая асацыяцыя" і інш.) і краязнаўцаў-аматараў (А. М. Белакоза, В. А. Ермалёнка, А. М. Пяткевіча, В. У. Скалабана, Я. С. Пархуты і інш.).

Пытанні гістарычнага краязнаўства на старонках бюлетэня "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі", часопіса "Спадчына", "Краязнаўчай газеты", "Беларускай мінуўшчыны", мясцовых неперыядычных выданняў. Шматтомная серыя кніг "Памяць".

### *Тэма 10. Гістарычнае краязнаўства Беларусі на сучасным этапе (1991 – 2020 гг.)*

Развіццё школьнага краязнаўства. Стварэнне сеткі школьных краязнаўчых музея.

Гісторыка-краязнаўчая праблематыка на абласных і раённых краязнаўчых канферэнцыях (Магілёў, Гродна, Браслаў, Навагрудак, Слуцк і інш.). Распрацоўка пытанняў мясцовай гісторыі.

Пытанні гістарычнага краязнаўства на старонках перыядычных выданняў: "Звязда", "Літаратура і мастацтва", "Культура", "Наша слова" і "Краязнаўчая газета". Дзейнасць беларускага фонда культуры. Насценны каляндар "Родны край".

Беларускае краязнаўства і валанцёрскі рух.

Беларускае краязнаўства і турызм. Дзяржаўная праграма "Замкі Беларусі". Рыцарскія турніры і фэсты. Нацыянальны форум "Музеі Беларусі".Фэсты экскурсаводаў.

## Раздзел IV. Краязнаўчыя музеі Беларусі

### *Тэма 11. Краязнаўчыя музеі Беларусі ў другой палове ХХ ст. (1945 – 1991 гг.)*

Характарыстыка музейнай сеткі Рэспублікі Беларусь. Тыпы і профілі музеяў.

Пошук краязнаўчых крыніц у музеях. Выкарыстанне калекцый музеяў розных тыпаў ў гісторыка-краязнаўчых даследаваннях. Прыцягненне рэчавых крыніц, кіна-, фота-, фонадакументаў, аудыя- і відэазапісаў для пашырэння крыніцазнаўчай базы гісторыка-краязнаўчых даследванняў.

Краязнаўчая дзейнасць музеяў.

Выкарыстанне архіўных фондаў у гісторыка-краязнаўчых даследаваннях. Парадак працы з архіўнымі дакументамі. Этапы пошуку і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбору архіўных дакументаў для гісторыка-краязнаўчых даследаванняў. Выданні дакументальных матэрыялаў.

### *Тэма 12. Тэма 12. Краязнаўчыя музеі Беларусі на сучасным этапе (1991 – 2022 гг.)*

Нацыянальны гістарычны музей Беларусі як метадычны і навуковы цэнтр музейнай краязнаўчай дзейнасці нашай краіны. Абласныя краязнаўчыя музеі – рэгіянальныя цэнтры краязнаўства. Школьныя краязнаўчыя музеі. Музеі вышэйшых навучальных устаноў. Выданні рэгіянальных краязнаўчых музеяў. Музейныя будынкі. Краязнаўчая дзейнасць музеяў-запаведнікаў. Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны і яго рэдакцыі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
### 3.1 Тэматыка семінарскіх і практычных заняткаў

Семінарскія і практычныя заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да стварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме.

**Семінар 1 Гісторыка – краязнаўчыя крыніцы і іх характэрыстыка.**

Асноўныя тыпы гісторыка-краязнаўчых крыніц.Інфармацыя краязнаўчага характара ў летапісях XII - XVIстст. Мемуарная літаратура як гісторыка-краязнаўчая крыніца. Картаграфічная крыніца. Даведачныя выданні розных тыпаў. Перыядычны друк ў сістэме крыніц вывучэння краю.

**Семінар 2 Гістарычнае краязнаўства ў XVIII – пачатку XIX ст.**

Характэрыстыка гісторыка краязнаўчых крыніц і даследаванняў ў XVIII ст. Дзейнасць Адукацыйнай Камісіі. Краязнаўчая дзейнасць пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі.

Экспедыцыі расійскіх вучоных і дзяржаўных дзеячоў на беларускай тэрыторыі.

**Семінар 3 Гістарычнае краязнаўства ў першай палове XIX ст.**

Уплыў Віленскага універсітэта на краязнаўчую дзейнасць на тэрыторыі Беларусі.

З. Даленга-Хадакоўскі, Т. Нарбут. Браты К. і Я. Тышкевічы. Археалагічная калекцыя музея ў Лагойску. Віленскі музей старажытнасцей.

А Г Кіркор.

**Семінар 4 Краязнаўчая дзейнасць у сярэдзіне другой паловы XIX – пачатку XX ст.**

IX археалагічны з’езд у Вільні, Е.Р.Раманаў. Царкоўна - археалагічныя музеі. Рэстаўрацыйныя працы П.П, Пакрышкіна ў Беларусі.

Археалагічныя калекцыі Беларускага музея ў Вільні. Вітебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. І Луцкевіч.

Рускае геаграфічнае таварыства і яго дзейнасць на тэрыторпыі Беларусі. Рэвалюцыя 1905-1907 гг. і яе ўплыў на беларускае краязнаўства. Роля “Нашей нівы”і выдавецтва “Загляне сонца і ў наша ваконца”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Семінар 5 Гістарычнае краязнаўства БССР (1921 – 1941гг.)**
**Дзейнасць Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК).**

Стварэнне і пашырэнне дзейнасці рэгіанальных краязнаўчых арганізацый.

Роля часопіса “Наш край”. Стварэнне краязнаўчых музеяў.

Згортванне краязнаўчага руху ў 1930-я гады. Сталінскія рэпрэсіі і забарона краязнаўства.

**Семінар 6 Гістарычнае краязнаўства ў другой палове XX ст**

Аднаўленне краязнаўства ў БССР. Школьнае і турыстычнае краязнаўства.

Стварэнне сеткі краязнаўчых музеяў ў БССР.

Стварэнне і дзейнасць Беларускага дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Стварэнне і выданне краязнаўчых часопісаў і бюлютэняў. Краязнаўчая дзейнасць грамадскіх таварыстваў і аб’яднанняў ў 80-я -90-я гады XX ст. Выданне і напісанне серыі кніг “Памяць”.

**Семінар 7 Гістарычнае краязнаўства Беларусі**
**на сучасным этапе.**

Школьнае краязнаўства .Школьныя краязнаўчыя музеі. Асвятленне пытанняў гістарычнага краязнаўства на старонках перыядычных рэспубліканскіх і рэгіянальных выданняў. Дзейнасць Беларускага фонда культуры. Насценны каляндар “Родны край”. Беларускае краязнаўства і турызм. Фэсты экскурсаводаў.

**Семінар 8 Краязнаўчыя музеі Беларусі**
**у XX – пачатку XXI стст.**

Краязнаўчыя музеі ў БССР (1924 – 1941 гг). Краязнаўчыя музеі Заходняй Беларусі (1919 – 1939 гг). Аднаўленне дзейнасці краязнаўчых музеяў ў паслеваенны періяд. Краязнаўчая дзейнасць музеяў-запаведнікаў.Нацыянальны гістарычны музей як метадычны цэнтр беларускага краязнаўства. Выданні краязнаўчых музеяў Беларусі.Нацыянальныя форумы “Музеі Беларусі”. Часопіс “Наша гісторыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

### 4.1 Заданні для сасмастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі краязнаўства.

Форма выканання работы – напісанне рэфератаў, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме (па выбару).

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай.

### 4.2 Пытанні да самаправеркі

1. Краязнаўчая дзейнасць Віленскага універсітэта (1803-1832гг).
2. Краязнаўчая дзейнасць Віленскага універсітэта (1919-1939гг).
3. Развіццё краязнаўчай думкі ў БССР (М.І.Каспяровіч, Д.М.Васілеўскі і інш.)
4. Часопіс "Наш край".
5. Стварэнне і дзейнасць Беларускага дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.
6. Бюлетэнь "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі".
7. "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі".
8. Часопісы "Спадчына" і "Беларуская мінуўшчына".
9. Шматтомная серыя кніг "Памяць".
10. "Краязнаўчая газета".
11. Часопіс "Наша гісторыя"

### 4.3 Пытанні да экзамена

1. Краязнаўства як навуковая і вучэбная дысцыпліна.
2. Гістарычнае краязнаўства як галіна агульнага краязнаўства. Беларусазнаўства і радзімазнаўства.
3. Краязнаўчая дзейнасць раённых музеяў.
4. Беларускае краязнаўства і валанцёрскі рух. Фэсты экскурсаводаў.
5. Беларускае краязнаўства і турызм.
6. Тыпы і профілі музеяў.
7. Характарыстыка музейнай сеткі Беларусі.
8. Краязнаўчая дзейнасць музеяў-запаведнікаў.
9. Школьныя краязнаўчыя музеі.
10. Абласныя краязнаўчыя музеі – рэгіянальныя цэнтры краязнаўства.
11. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.
12. Краязнаўчыя музеі Беларусі ў другой палове XX ст. (1945–1991 гг.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. Краязнаўчая праца сучасных беларускіх пісьменнікаў (Адам Мальдзіс, Кастусь Тарасаў, Уладзімір Караткевіч, Уладзімір Арлоў і інш.).Краязнаўства як навуковая і вучэбная дысцыпліна.

14. Краязнаўчая дзейнасць грамадскіх таварыстваў і аб'яднанняў у канцы XX – пачатку XXI стст. ("Майстроўня", "Талака", "Паходня" і інш.).

15. Стварэнне сеткі школьных краязнаўчых музеяў.

16. Краязнаўчая тэматыка на старонках газеты "Звязда". "Культура", "Літаратура і мастацтва".

17. Краязнаўчая дзейнасць сучасных беларускіх музеяў.

18. Краязнаўчая дзейнасць Міколы Ермаловіча і Міхася Ткачова.

19. Краязнаўчая дзейнасць Адама Мальдзіса.

20. Беларусі фонд культуры і яго "Краязнаўчая газета".

21. Дзейнасць Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны ў краязнаўчым накірунку. Роля газеты ТБМ "Наша слова".

22. Шматтомная серыя кніг "Памяць" і яго роля ў вывучэнні беларускай гісторыі.

23. "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" і яго краязнаўчая характарыстыка.

24. Стварэнне і дзейнасць Беларускага дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

25. Стварэнне сеткі краязнаўчых музеяў у абласных і раённых цэнтрах Беларусі.

26. Аднаўленне краязнаўчага руху ў БССР пасля Другой сусветнай вайны.

27. Роля інстытута беларускай культуры ў развіцці краязнаўства ў БССР.

28. Стварэнне музеяў і фарміраванне гісторыка-краязнаўчых калекцый ў другой палове XIX – пачатку XX стст.

29. Краязнаўчая дзейнасць Я.Р.Карскага і М.В. Доўнар-Запольскага.

30. Краязнаўчая дзейнасць Аляксея Сапунова і Еўдакіма Раманава.

31. Навуковыя таварыствы Расійскай імперыі, што займаліся гісторыка-краязнаўчымі даследаваннямі.

32. Пісьмовыя крыніцы па гістарычнаму краязнаўству ў другой палове XIX ст.

33. Гістарычнае краязнаўства як галіна агульнага краязнаўства. Беларусазнаўства і радзімазнаўства.

34. Краязнаўчая дзейнасць Адама Кіркора, Уладзіслава Сыракомлі і Пятра Шпілеўскага.Гісторыка-краязнаўчыя крыніцы і іх тыпы.

35. Краязнаўчая дзейнасць братоў К. і Я.Тышкевічаў.

36. Краязнаўчая дзейнасць Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага, Тэадора Нарбута.

37. Гістарычнае краязнаўства ў Рэчы Паспалітай

38. Краязнаўчая дзейнасць на Беларусі у канцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

39. Уплыў Віленскага ўніверсітэта на разгортванне гісторыка-краязнаўчага вывучэння Беларусі XIX – пачатку XX стст.

40. Беларуска-літоўскія летапісы і хронікі. Дзейнасць Мікалая Улашчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

### 1.1 Тэматычны план

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінары | КСР |
| Уводзіны | 2 | | |
| **Раздзел I. Тэарэтычныя асновы гістарычнага краязнаўства** | | | |
| *Тэма 1.* Краязнаўства як навуковая і вучэбная дысцыпліна | 2 | 2 | 2 |
| *Тэма 2.* Характарыстыка гісторыка-краязнаўчых крыніц. | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Гістарычнае краязнаўства як галіна агульнага краязнаўства. | 2 | | 2 |
| **Раздзел II. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVIII – XIX стст.** | | | |
| *Тэма 4.* Гістарычнае краязнаўства ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 5.* Гістарычнае краязнаўства ў другой трэці – сярэдзіне XIX ст. (1825 – 1861 гг.) | 2 | | 2 |
| *Тэма 6.* Гістарычнае краязнаўства ў другой палове XIX ст. (1861 – 1900 гг.) | 2 | 2 | 2 |
| **Раздзел III. Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XX – пачатку XXI стст.** | | | |
| *Тэма 7.* Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў пачатку XX ст. (1900 – 1921 г.) | 2 | 2 | |
| *Тэма 8.* Гістарычнае краязнаўства БССР (1921 – 1941 гг.). Краязнаўства Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) | 4 | 2 | |
| *Тэма 9.* Гістарычнае краязнаўства Беларусі ў другой палове XX ст. (1945 – 1991 гг.) | 6 | 2 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінары | КСР |
| *Тэма 10.* Гістарычнае краязнаўства Беларусі на сучасным этапе (1991 – 2020 гг.) | 4 | 2 | |
| **Раздзел IV. Краязнаўчыя музеі Беларусі** | | | |
| *Тэма 11*. Краязнаўчыя музеі Беларусі ў другой палове ХХ ст. (1945 – 1991 гг.) | 4 | 2 | |
| *Тэма 12*. Краязнаўчыя музеі Беларусі на сучасным этапе (1991 – 2012 гг.) | 8 | 2 | 2 |
| **Разам** | 34 | 12 | 12 |

## 5.2 Літаратура

*Асноўная*


1. Григорьев, Алексей Алексеевич. География всемирного наследия : учебное пособие для вузов / А. А. Григорьев. - 2-е изд., испр. и доп. - Москва : Юрайт, 2021. - 296, [2] с. : рис. ; 25x16 см. - (Высшее образование). - Библиогр.: с. 283-298. - ISBN 978-5-534-07236-5.
2. Кулемзин, Анатолий Михайлович. Памятники истории культуры и их охрана : учебное пособие для вузов / А. М. Кулемзин. - 2-е изд. - Москва : Юрайт, 2020. - 145, [1] с. ; 24x15 см. - (Высшее образование). - Библиогр. в конце гл., библиогр. в подстроч. примеч. - ISBN 978-5-534-11569-7 (Издательство Юрайт). - ISBN 978-5-8154-0417-5 (КемГИК).
3. Локотко, Александр Иванович. Мелодии и летопись эпох : по страницам истории белорусской культуры / А. И. Локотко ; [ред. Ю. В. Баженов]. - Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. - 165, [2] с. : ил., цв. ил. ; 25x25 см. - Библиогр.: с. 166. - ISBN 978-985-11-1073-1
4. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэб.дапам. / В.І.Саітава. – Мінск: Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 203 с.
5. Трансляция белорусской культуры между поколениями в Республике Беларусь : монография / Гродненский областной институт развития образования ; под науч. ред. В. П. Тарантея. - Гродно : Гродненский


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

областной институт развития образования, 2018. - 207 с. : ил., табл. ; 21x15 см. - Библиогр.: с. 174-182 (122 назв.). - ISBN 978-985-6702-34-4.

## 5.3 Дадатковая літаратура

1. *Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е гг. XX в. /Л. В. Алексеев; под ред. Б. А. Рыбакова. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 206 с.
2. *Аляксееў, Л.В*. Гродна і помнікі Панямоння /Л.В.Аляксееў. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 191 с.
3. *Археалогія* Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2009 – 2011. – 496 с.
4. *Археалогія* і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск: БелЭн, 1993. – 702 с.,іл.
5. *Историческое* краеведение Белоруссии: Учеб пособие / [Ваганова А. Н., Загорульский Э. М., Космылёв В. С. и др.]; Под. ред. Э М. Загорульского. – Мн.: Изд-во БГУ, 1980, – 264 с.
6. *Карлюкевіч, А.М.* Далёкія і блізкія суродзічы: з дзённіка краязнаўцы /Алесь Карлюкевіч. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2012. – 192 с.
7. *Каспяровіч, М.* Краязнаўства / М. Каспяровіч. – Мн.: Белдзяржвыдавецтва, 1929. – 159 с.
8. *Каханоўскі, Г.А*. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. / Г. А. Каханоўскі; навук. рэд. Л. Д. Побаль. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.
9. *Лыч, Л. М.* Краязнаўства – крыніца ведаў і нацыянальнага сталення / Л. Лыч. – Мн.: Бел. фонд культуры, 2004. – 49 с.
1. *Півавар, М.* В. Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны, XVI – 1944 г.: даведнік / М. В. Півавар. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2006. – 175 с.
10. *Півавар, М.В.* Музеі Віцебска на пачатку XXI ст. / М.В.Півавар. – Віцебск: УА “ВДУ імя. П.М.Машэрава, 2012. – 180 с.
11. *Самусік, А. Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: Вучэбн. дапаможнік / А. Ф. Самусік. – Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.
12. *Сыракомля, У.* Вандроўкі па маіх былых ваколіцах: Успаміны, даследаванні, гісторыі і звычаяў / У. Сыракомля; Пер. з польскага, прадм. і камент. К. Цвіркі. – Мн.: Полымя, 1992. – 159 с.
2. *Ткачоў, М. А.* Старажытны Мсціслаў / М. А. Ткачоў, А. А. Трусаў. – Мінск: Полымя, 1992. – 110 с.
13. *Улашчык, М.* Краязнаўства: (Нататкі пра бадзянні ў 1924–29 гг.). З рукапіснай спадчыны / М. Улашчык; (Падрыхтоўка тэксту і каментарыі Я. М. Кісялёва, В. У. Скалабана. Рэд. калегія Н. М. Дзятчык і інш. – Мн.: БелНДІДАС – Пейто, 1999. – 158 с.
3. *Цішчанка, І. К.* Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50–60-я гг. XIX ст. / І. К. Цішчанка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – С. 36–64.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Шпилевский, П.* Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П. М. Шпилевский; [Предислов., текстол. подготов., примеч. и коммент. С. И. Кузнецовой]. – Мн.: Беларусь, 2004. – 250 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ